УДК 338.48:502

Н.І. Здановіч, ст. выкладчык кафедры турызму,
прыродакарыстання і паляўніцтвазнаўства (БДТУ, Мінск)

# МЛЫН ЯК АРТЭФАКТ КУЛЬТУРЫ: МАГЧЫМАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ Ў ЭКСКУРСІЙНА-ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Любы экскурсійны аб'ект гэта падстава пагутарыць на нейкую тэму, магчымасць "праз кроплю ўбачыць акіян", паколькі экскурсійны расказ складаецца з розных падтэм, звязаных з геаграфіяй і гісторыяй аб'екта. Млыны – не включэнне. Узнікненне млыноў – этап на шматтысячагадовым шляху чалавека ў пошуку крыніцы энергіі – таннай і аднаўляльнай. Іх канструкцыя – прыклад выкарыстання аднаўляльнай і малазатратнай энергіі.

Млыны былі практычна ў кожным паселішчы, пачынаючы з эпохі еўрапейскага сярэднявечча. Колькасць млыноў у акрузе залежала ад спросу на іх паслугі. Прычым будаваліся яны як асобныя збудаванні з адным прызначэннем (для вытворчасці мукі), так і ў комплексе з іншымі аб'ектамі, у залежнасці ад патрэбы і абставін.

Прыкладам, у Цімкавіцкім уладанні ў 1691 г. было адначасова – "в разных местах 5 мельніц с сукновальней" [1, с. 53] "У этой мельницы сукновальня на той же запруде, на одном колесе…"(1, с. 54). У гэтым выпадку млын быў крыніцай энергіі для вытворчасці сукна. Пры млынах часам будаваліся пякарні ці корчмы дзеля дадатковага даходу з тых, хто карыстаўся паслугамі млынара.

Для раскрыцця вобраза млыноў як экскурсійных аб'ектаў неабходна раскрыць наступныя падтэмы:

А) Млын як збудаванне і арганізацыя тэхналагічнага працэсу на ім.

Б) Прававы статус млыноў і млынароў.

В)Міфалагізацыя вобраза млына і млынара.

Г) Выкарыстанне млыноў у сучаснай турыстычнай дзейнасці.

<u>А) Млын як збудаванне і арганізацыя тэхналагічнага працэсу на ім.</u>

<u>Тыпы млыноў.</u>

Млыны былі вадзяныя і ветраныя. Тып млына залежаў не толькі ад патрэбы, але і ад геаграфічнага становішча: наяўнасці узгоркаў ці ракі. Такія млыны будаваліся па ўсёй Беларусі і дзейнічалі да сярэдзіны XX. Абодва тыпа млыноў адрозніваліся колькасцю жорнаў – на адзін ці два, як і колькасць паверхаў (ад аднагода трох). Вадзяныя млыны будаваліся на беразе ракі. Для добрай працы на ёй будаваўся стаў і ставіліся засланкі для назапашвання ці спуску (пры патрэбе) ва-

ды. Вельмі рэдка вадзяныя млыны будаваліся над ракой і кола знаходзілася ў падвальнай частцы млына. Перавага іх у тым, што млын працуе круглы год, таму што вада не замярзае, а значыць кола круціцца і ўзімку. Адзін з млыноў такой канструкцыі захаваўся ў в. Дворышча пад Лідаю. Па даследваннях навукоўцаў, млыны-ветракі пачалі будаваць пазней, чым вадзяныя амаль на тысячагоддзе. Існавалі два тыпа ветракоў, што розніліся спосабам "лавіць вецер": галандскія, у якіх рухомай была толькі верхняя частка (паварочвалася толькі шапка з крыламі) і млыны-«казлоўкі», калі да ветру паварочвалася ўся канструкцыя. У іх была нага-дышла і паваротнае бервяно (рычаг, які паварочвалі людзі). Вятракі абшываліся вертыкальна прыбітымі даволі тонкімі дошкамі, былі невялікія па аб'ёму і мелі, як правіла, трапецападобную форму. Падлога была прыўзнята над зямлёй і мацалалася на каркасе, які прымацоўваўся да "нагі".

Матэрыялы збудвання.

Пры будаўніцтве млыноў абодвух тыпаў маглі выкарыстоўваць дрэва і валунны ці цёсаны камень. Толькі для вадзяных млыноў камень быў асноўным будаўнічым матэрыялам (з яго млын мог будавацца цалкам, ці толькі ніжні паверх, а другі быў драўляны). Гэта было лагічна, бо млын стаяў пры вадзе, а дрэва хутка псавалася. Аднак у інвентары м. Цімкавічы 1691 г. апісваецца "мельница в Паледях на реке с деревянным срубом" и "мельница в Скепеве новая, бревенчатая" [1, с. 54]. Так што цалкам каменныя млыны, мяркуючы па збудаваннях рознай ступени захаванасці, – з'ява, распаўсюджаная з 19 ст.

Мяркуючы па гістарычных крыніцах і парэштках млыноў, у 17-19 стст. ветракі былі драўляныя, аднак і у драўляных ветракоў "галандскага" тыпу падмурак рабіўся звычайна з каменю. Нажаль, у большасці пісьмовых крыніц пры апісанні млыноў галоўнае значэнне надавалася не будаўнічаму матэрыялу, а колькасці жорнаў ("камянёў") у млынах-ветраках і колаў ("паставоў") у вадзяных млынах. Таму дакладна прасачыць працэс змены прыярытэтаў у часе ў будаўнічых матэрыялах для вадзяных млыноў па пісьмовых крыніцах немагчыма. Пра ўзровень даходу з млына звычайна сведчыць пакрыццё яго даху. Найчасцей млыны крыліся дранкай. Самыя даходныя, звычайна на 2 жорны – гонтам. "Пруд у тимковицкого господского двора  на р. Мажа, со шлюзом и щитами для спуска воды…Там же мельница на 2 колесах, покрытая гонтом, со всеми мельничными принадлежностями, включая железные. Исправная» (1, с.133). Маленькія, маладаходныя млыны крылися часам саломаю. "Пруд в Паледях на той же р. Мажа, со шлюзом и щитами для спуска воды. Там же мельница на 1 колесе, покрытая соломой…Исправная» [1, с.133]. Абедзве – па інвентары 1730 г.

Б) Прававы статус млыноў і млынароў.

Прававы статус млыноў.

Належалі млыны гаспадарам фальваркаў, але над імі апекавалася дзяржава: ужо па Статуце 1588 г. бачны клопат як пра захаванне млыноў, так і кара за шкоду, якая можа ад іх быць. У Статуце ВКЛ пра млыны ўзгадваецца ў трох раздзелах. У раздзелае VII – пра ўмовы арэнды ў гаспадароў песелішча: калі арандатар пераходзіць да другога гаспадара, ён траціць права на арэнду млына ў папярэдняга [2, с. 237]. У артыкуле 21 раздзела IX у выпадку, калі стаў вадзяного млына ніжэй па рацэ з-за пад'ёму ўзроўню вады затапіў млын вышэй па рацэ, вінаваты павінен заплаціць штраф за шкоду 12 рублёў грошай і пакрыццё страт за час, кали млын не мог працаваць [2, с. 263]. Такі ж штраф, згодна артыкулу 7 раздзела X, прадугдеджаны за наўмыснае псаванне става і спуск вады з яго. Калі ж пры гэтым быў пашкоджаны ці спалены сам млын, злачынца павінен ці аднавіць яго, ці заплаціць грошы на яго аднаўленне, плюс страты за прастой млына [2, с.425].

Асоба млынара.

Найчасцей млынар – гэта не ўласьнік, а арандатар.

У інвентары 1622 г. фальварка Быстрыца чытаем "Возле этого села построена корчма, а около нее мельница с 2 колесами. Эту корчму и мельницу арендует Роман Лавринович, подданный его милости, из того же села Быстрицы, и платит ежегодно по 100 коп лит. гр." [1, с.18]. Такая ж практыка арэнды комплексу "млын-карчма" працягвалася і бліжэй да канца 17 ст., згодна інвентара тых жа Цімкавіч 1670 г.: " Арендной платы с корчмы и мельницы 650 злотых". [1, с.38]. Арандатарамі корчмаў, якія будаваліся асобна, на гандлёвай плошчы ці пры ўездзе ў паселішча, звычайна былі яўрэі, а вось млыноў – асобы са славянскімі прозвішчамі. Так, у інвентары фальварка Скепева 1638 г. уладання Цімкавічы значыцца "Яков мельник" [1, с.25], а ў 18 ст. арандатары – "Онисько мельник", "мельник Янкевич" (1713 г.), [1, с. 97, 101], Ян Авдюкович (за 1730 г.) [1, с.145], Марцін Авдюкевіч – за 1761 [1, с.175]. Мяркуючы па прозвішчах, прафесія млынара была сямейнай справай. Прыкладам, у інвентары 1713 г. значыцца "Савва Фанкевич", а ў 1730 – "Лука Фанкевич мельник" [1, с. 156].

Што датычыцца колькасці млыноў, то даследчыкі лічаць, што, прыкладам, у 18 ст. млыны розных памераў былі амаль у кожным паселішчы. Так, ва ўладанні Цімкавічы на 1761 г. значацца 5 млыноў (2 – на 2 кола і 2 – на 1 кола, а адзін – без пазначэння [1, с.204].

Прывілегіі млынароў.

Быць млынаром – своеасаблівая прывілегія, бо яны вызваляліся ад многіх падаткаў і абавязкаў. У інвентары Цімкавіцкіх уладанняў за 1670 г. чытаем: "Барщина, сторожевая повинность, подводы в ближ-

ний и дальний путь, отбываемые поочередно, за исключением мельника, который не обязан ездить с подводами и отбывать сторожевую повинность…” [1, с.47]. Млынары толькі плацілі “калёснае”, у залежнасці ад колькасці колаў вадзянога млына. Так, у 1761 г. падатак складаў 24 злотых за 1 кола і 48 – за 2. [1, с. 204]. Мала таго – пра млыны павінны былі клапаціцца ўсе падданыя – жыхары навакольля, якія ім карыстаюцца. “По старому обычаю огородники должны выходить на починку плотин при тимковичской мельнице в свои свободные дни” (1691 г.) [1, с.82]. Гэты ж від павіннасці паўтораны для жыхароў Цімкавічаў і вёскі Агароднікі на 1730 г. [1, с.146].

Прычына – найперш у тым, што крылы ці колы млыноў ніколі не павінны спыняцца. Таму нельга замінаць працаваць млынару, забіраць на іншую працу.

Выхаваўчае значэнне млыноў.

У памяшканні млына забаранялася курыць (з-за пагрозы пажару). Гэта датычылася правіл паводзін і работнікаў, і наведвальнікаў. А па інструкцыі для работнікаў млына ў Заслаўі на канец 19 і пачатак 20 ст. адчувальныя штрафы на іх накладаліся не толькі за абразу старэйшага па пасадзе, але і за брыткаслоўе. Гэта быў своеасаблівы “маральны кодэкс” для тых, хто працаваў на млыне ці прыязджаў туды на памол.

В) Міфалагізацыя вобраза млына і млынара.

У беларускім фальклоры прасочваюцца паважна-насцярожаныя адносіны да млынароў: ў іх была слава чараўніка і ведзьмара, бо яны прымушаюць працаваць на сябе ваду і вецер, а значыць знаюцца і з вадзянікамі, і з нячысцікамі, што жывуць у ветраках. Такую славу млынары падзяляюць толькі з кавалямі (якія за майстэрства лічыліся чараўнікамі).

Уночы насельнікі ветракоў, ва ўяўленні людзей, – чэрці, д’яблы. Таму людзі странна абыходзілі ветракі начною парою. Вадзяныя ж млыны – уладанне Вадзяніка (ля млыноў вадзянікоў столькі, колькі ў млыне паставоў (вадзяных колаў), на вяршыні якіх яны сядзяць). Вадзянік можа паламаць ставы, спусціць ваду, калі яго не задобрыць. Таму млынары прыносяць ахвяру вадзяніку перад зімой (кідаюць пад кола кавалак сала, ці нават шынкі – каб не разбурыў плаціны, каб не абмерзла кола і не спыніўся млын).

Сімвалічны вобраз млына.

Млын – своеасаблівы сімвал жыцця: калі (ці пакуль) круцяцца крылы ці рыпяць колы – вакол есць людзі, есць патрэба ў ежы, жыццё працягваецца. Таму млын – працаўнік!

Аднак у літаратурных творах адлюстравана яшчэ адна роля млына: ён бунтар і звадаяж. Таму што менавіта млыны былі месцам

збору людзей, цэнтрам зносін з наваколлем, featuring рознародных кантактаў. Тут адбываўся абмен навінамі, а з-за нядобрай славы млыноў у начную пару яны былі месцам патаемнога збору, тут нараджаліся змовы. Менавіта на млыне чытаў Кастусь Каліноўскі сваю “Мужыцкую праўду”. Калі ў сярэднявеччы з’явіліся першыя млыны, першай супраць іх паўстала святая царква! Прычыны – тое самае вальнадумства (пагроза распаўсюджання ерасяў з-за безкантрольнага скаплення людзей), а яшчэ і распуста, таму што пачалі ўзнікаць комплексы – “карчма пры млыне”, і там атабарываліся жанчыны самай старажытнай прафесіі.

Г) Выкарыстанне млыноў у сучаснай турыстычнай дзейнасці.

У канцы 20 – пачатку 21 ст. прасочваюцца разнастайныя спосабы рэвалярызацыі будынкаў млыноў, паколькі па прамым прызначэнні з сярэдзіны 20 ст. яны не выкарыстоўваюцца.

У 90-я гады 20 ст. у Заслаўі была спроба сумясціць функцыю музеефікацыі комплекса млына пачатку 20 ст. і выкарыстанне яго па прамой функцыі: пры музейным комплексе “Хата завозніка” працаваў млын, крупадзёрка і нават кузня.

Выкарыстанне памяшкання млыноў пад музеі адзначаны, напрыклад, ў Паставах і Вілейцы. У турыстычным комплексе «Наносы Отдых» рэканструяваны 2 млына-ветрака розных тыпаў. Адзін з іх прыстасаваны не толькі пад памяшканне для музейнай калекцыі самагонных апаратаў, але і ў якасці назіральнай пляцоўкі.

Былы вадзяны млын у в. Дворышча пад Лідаю стаў турыстычным комплексам “Вольны мельнік” з экскурсіяй-дэгустацыяй пра традыцыі піваварэння ў Еўропе і Беларусі.

Млыны выкарыстоўваюцца і для размяшчэнне аб’ектаў харчавання, як у а/г Гервяты.

У некаторых турыстычных комплексах млыны збудаваны ў якасці сімвалаў часу ці арт-аб’ектаў, як у комплексе “Этнаграфічная вёска” у Буйнічах пад Маглёвам. Аднак большасць былых вадзяныя млыноў, і асабліва ветракоў, нажаль, паступова дабураюцца, нягледзячы на тое, што іх выкарыстанне ў турысцка-экскурсійнай дзейнасці дазволіла б раскрыць шмат старонак у гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі, стаць месцамі адраджэння забытых тэхналогій, звязаных з традыцыйным харчаваннем, гісторыяй земляробства і традыцыямі рацыянальнага прыродакарыстання.

## ЛІТАРАТУРА

1. Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII–XVIII вв.: владение Тимковичи. – Мн.: Наука и техника, 1982. –216 с.

2. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 573 с.